УДК 7.071(476.5):75.04+929

# ГУЛЬНІ З ВОБРАЗАМІ Ў ТВОРАХ АЛЕГА КРОШКІНА: АД ІРОНІІ ДА ГРАТЭСКУ

***Цыбульскі М.Л.***
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава", Віцебск*

*У артыкуле разглядаецца жыццё і творчасць вядомага беларускага мастака Алега Крошкіна (1950–2020). Прыгадваюцца асноўныя кампазіцыі, што былі створаны ім на розных этапах жыцця. Падрабязна аналізуюцца персанальныя выставы.*

*Цэнтральная ўвага нададзена творчым прыярытэтам і характару вобразнасці ў жывапісных творах А. Крошкіна. Калажнае мысленне, якое ці не з самага пачатку творчасці стала яскравай прыкметай яго творчасці, сваімі вытокамі мела зварот мастака да спадчыны авангарда першай паловы XX стагоддзя. Калаж для Алега Крошкіна на некалькі дзесяцігоддзяў становіцца асноўным прынцыпам рэпрэзентацыі мастацкіх вобразаў. Паэтыка паўсядзённасці вызначае фармат жанравых інтэрпрэтацый у творах мастака. У сюжэтных кампазіцыях штодзённасць набывае то пафасна ідылічны, рамантычны, то гратэскава-іранічны характар.*

*Іронія і гульня з'яўляюцца дзвюма канстытуяванымі катэгорыямі мастацкага свету А. Крошкіна на ўсім працягу яго творчага шляху. Таксама і цікавасць мастака да паэтыкі "гарадскога фальклору", і дыскурс наіўнасці застаюцца блізкімі мастаку на розных этапах творчасці. Сродкамі мастацкай выразнасці становяцца колер, рытмічная інтанацыя, тэмпаральнасць, фактурнасць і ў цэлым агульная архітэктоніка кампазіцыйнага і жывапіснага ладу карціны.*

*Колер у абстрактных кампазіцыях Крошкіна – медыятар эмацыянальнага і філасофскага адначасова. Безумоўна, у эмацыянальным уздзеянні колеру ў працах мастака вялікае значэнне мае рытм і характар каларыстычных спалучэнняў.*

***Ключавыя словы:*** *Алег Крошкін, віцебская мастацкая школа, мастацтва XX стагоддзя, жывапіс, графіка, Віцебск, калажнае мысленне, іронія, гарадскі фальклор.*

*(Искусство и культура. – 2021. – № 1(41). – С. 18–23)*

# GAMES WITH IMAGES IN THE WORKS OF OLEG KROSHKIN: FROM IRONY TO GROTESQUE

***Tsybulsky M.L.***
*Educational Establishment "Vitebsk State PM Masherov University", Vitebsk*

*The article examines life and work of the famous Belarusian artist Oleg Kroshkin (1950–2020). The main compositions that were created at different periods of his life are recalled. Personal exhibitions are analyzed in detail.*

*The primary attention is paid to the creative priority and character of imagery in A. Kroshkin's paintings. Collage thinking, which almost from the very beginning of his creative path became a bright feature of his artistic style, had its origins in the artist's appeal to the legacy of the avant-garde of the first half of the twentieth century. For Oleg Kroshkin collage became the main principle of representation of artistic images for several decades. The poetics of everyday life determines the format of genre interpretations in the artist's works. In the plot compositions the everyday life acquires a pathetically idyllic, romantic or grotesque-ironic character.*

*Irony and play are the two constituent categories of A. Kroshkin's art world throughout his career. As well as the artist's interest in the poetics of "urban folklore", the discourse of naivety remains close to the artist at different periods of his career. The means of artistic expression are color, rhythmic intonation, temporality, texture and the architecture of the compositional and pictorial image of the picture in general.*

*Color in Kroshkin's abstract compositions is a mediator of the emotional and the philosophical at the same time. Undoubtedly, rhythm and nature of color combinations are of great importance in the emotional impact of color in the artist's works.*

***Key words:*** *Oleg Kroshkin, Vitebsk Art school, Art of the XX century, painting, graphics, Vitebsk, collage thinking, irony, urban folklore.*

*(Art and Cultur. – 2021. – № 1(41). – P. 18–23)*

*Адрас для карэспандэнцыі: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

Репозиторий ВГУ





У пачатку лістапада мінулага года пасля працяглай хваробы пайшоў з жыцця вядомы беларускі мастак Алег Крошкін. Творчасць гэтага віцебскага жывапісца і графіка на ўсіх этапах уражвала гледачоў разнастайнасцю вобразных і сюжэтных калізій, яркім і выразным каларыстычным строем, неардынарнасцю сэнсавых канструкцый. Нярэдка выклікала бурныя спрэчкі, але ніколі не пакідала наведвальнікаў яго персанальных выстаў абыякавымі. У Віцебску А. Крошкіна ведалі і любілі як шчырага і сур'ёзнага мастака, як вернага і надзейнага сябра.

Мэта артыкула – прааналізаваць жыццёвы і творчы шлях віцебскага мастака Алега Крошкіна, разгледзець асаблівасці вобразнасці ў яго жывапісных і графічных творах.

**Жыццёвы шлях мастака.** Алег Уладзіміравіч Крошкін нарадзіўся 7 ліпеня 1950 года ў пасёлку Сокал-Далінскі Сахалінскай вобласці (Расія). З пяці гадоў ён наведваў дзіцячую студыю, але, як пазней адзначаў сам мастак, займацца з аднагодкамі яму было нецікава. Таму бацька Алега – вайсковы афіцэр, які быў да таго ж мастаком-самавукам, адвёў сына ў дарослую студыю, дзе юнаку вельмі хацелася "навучыцца маляваць як дарослыя, г.зн. авалодаць майстэрствам" [1]. Адносіны да мастацтва, дух творчасці, "якія культываваўся ў сям'і і студыйным асяроддзі, а таксама відавочны талент і поспехі сфарміравалі раннюю мастакоўскую індывідуальнасць Крошкіна" [2]. Будучы творца апантана займаўся мастацкай самаадукацыяй: шмат чытаў пра мастацтва, наведваў гурток графікі, спрабаваў пісаць акварэллю.

У 1968 годзе Алег Крошкін паступіў вучыцца на мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Вучыўся даволі добра, па мастацкіх дысцыплінах былі выдатныя адзнакі, на праглядах яго работы нярэдка забіралі ў фонд. І разам з тым А. Крошкін быў не падобны на іншых студэнтаў, вылучаўся "самастойнасцю мыслення і веданнем мастацтва мадэрнізму" [2]. Ужо пад час вучобы спрабаваў эксперыментаваць, хоць рабіў гэта часцей "для сябе".

У 1972 г. Алег Крошкін завяршае вучобу на мастацка-графічным факультэце. Яго дыпломная работа на тэму "Мой горад", на жаль, не ўразіла дзяржаўную камісію. Сам мастак лічыў нізкую адзнаку, што была пастаўлена за гэты твор, своеасаблівай помстай за яго палітычныя погляды [1]. "Я ж, калі вучыўся, быў антыкамуністам і антысаветчыкам", – успамінаў А. Крошкін [3]. Вядомы віцебскі мастак А. Малей, які ў той час быў студэнтам, адзначаў, што дыпломная работа Алега Крошкіна адрознівалася "наватарствам, яркім вобразным рашэннем, дынамікай барацьбы, фундаментальнасцю, манументальнасцю і не ўпісвалася ў звыклыя рамкі" [4].

Пасля заканчэння інстытута А. Крошкін два гады працаваў настаўнікам чарчэння і малявання ў Барысаўскай школе-інтэрнаце. У той час ён шмат увагі надаваў жанру партрэта, маляваў вучняў і выкладчыкаў.

У войску, куды А. Крошкін трапіў служыць у 1974 годзе, ён не пакідаў мастацтва, удзельнічаў у выставах салдацкай творчасці. Да таго ж у размяшчэнні часці была майстэрня, дзе ён з захапленнем маляваў асацыятыўныя работы.

Пасля службы ў арміі А. Крошкін вяртаецца ў Віцебск. Некалькі год працуе ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці (1975–1977), потым уладкоўваецца мастаком у ПКБ АСК (1977–1978), мастаком па інтэр'ерах на Віцебскім тэлевізійным заводзе (1978–1982). Праца на камбінаце "Мастацтва" (1983–1986) стала апошнім этапам яго дзейнасці на дзяржпрадпрыемствах і ў навучальных установах.



Рэпазіторый ВДУ

Далейшая частка яго жыцця была прысвечана пераважна творчасці.

У 1970–1980-я гады А. Крошкіным створаны “Нацюрморт з лямпай” (1975), “Праpослы квадрат” (1975), “Аўтапартрэт” (1976), “Час і горад” (1976), “Гандляркі семкамі” (1977), “На базары” (1977), “Віцебскі час” (1978), “Два дрэвы” (1985), “Тры дрэвы” (1985), “Кампазіцыя ў жоўтых тонах” (1988), “Аўтапартрэт” (1989), “З жыцця птушак” (1989–1991) (серыя з 10 работ), “Мой горад” (1989–1991) (серыя з 10 работ), “Партрэт аголенай” (1989) і іншыя.

Заяву, якую А. Крошкін напісаў на ўступленне ў Беларускі саюз мастакоў 3 верасня 1991 года, падтрымалі сваімі рэкамендацыямі вядомыя мастакі – Ф. Гумен, У. Вітко, А. Скавародка. Дзевяностыя гады мінулага стагоддзя сталі даволі прадуктыўнымі для творчасці А. Крошкіна. У гэты час ім былі напісаны “Агрэсія” (1990), “Думкі пра горад” (1990), “Стары горад” (1990), “Партрэт мастака А. Скавародкі” (1991), серыя абстрактных работ (10 твораў) (1991), “Піва” (1992), “Нацюрморт з рыбай” (1992), “Аднойчы зімовым вечарам” (1993), “Апошні аўтобус” (1993), “Пейзаж з трамваем” (1993), “Закаханыя” (1994), “Каля калонкі” (1995), “Танцпляцоўка” (1996), “Творчасць” (1997), “Гульня ў дурня” (1998), “Сябры. На кірмашы” (1998), “Ціхае жыццё” (1998), “Парк культуры” (1999), “Віцебскія палюбоўнікі” (1999).

На працягу жыцця А. Крошкін працаваў у станковым жывапісе і графіцы. У 2000-я мастак піша свае вядомыя палотны “Чарга” (2000), “Жарсць. Закаханыя” (2000), “Месяц над горадам” (2000), “Афіцэр з паненкай гуляюць” (2001), “Рытмы вечара” (2001), “Мастак і мадэль” (2003), “Гандлярка кветкамі” (2004), “Мастак на пленэры” (2004), “Рух” (2004), “Торс” (2005), “Бойка” (2007), “Ля віцебскіх вытокаў” (2007), “Белы колер перамагае” (2012) і іншыя [5].

Мастак Алег Крошкін памёр 7 лістапада 2020 года пасля працяглай хваробы, ён не дажыў некалькі тыдняў да сваёй юбілейнай выставы ў Віцебскім мастацкім музеі. Яго творы сёння знаходзяцца ў народным музеі г. Шчэціна (Польшча), Віцебскім мастацкім музеі, арт-цэнтры Марка Шагала (Віцебск), Музеі сучаснага мастацтва (Мінск), калекцыі Прыёрбанка, Ратушы горада Франкфуртана-Одэры, прыватнай калекцыі паэта Яўгена Еўтушэнка (Расія), айчынных і замежных прыватных калекцыях.

“Галоўнае для мастака – свабода, – часта падкрэсліваў А. Крошкін, – але яна дастаецца таму, хто заўсёды ў пошуку, хто пастаянна займаецца самаадукацыяй (...) Толькі назапашанае ў табе самім дазваляе рабіць уласныя адкрыцці, карыстацца ўласнымі пластычнымі сродкамі ў малюнку, у колеры” [6].

**Удзел у мастацкіх выставах і пленэрах.** Алег Крошкін прымаў удзел у выставах з 1971 года. Першая персанальная выстава А. Крошкіна прайшла ў час вучобы на пятым курсе ў інстытуце. Сярод групавых выстаў, у якіх мастак прымаў удзел у другой палове 1970-х гг., былі абласныя і рэспубліканскія экспазіцыі (выстава, прысвечаная 60-годдзю СССР (1977), выстава, прысвечаная 50-годдзю камсамола БССР (1978), выстава «Моладзевая» (1980) і інш.).

А. Крошкін паставіў перад сабой мэту ўступлення ў Саюз мастакоў, таму значна актывізаваў экспазіцыйную дзейнасць. Знакавымі для творцы сталі міжнародныя выставы, у якіх ён прыняў удзел у другой палове 1980-х – пачатку 1990-х гадоў. Сярод іх міжнародныя выставы ў Каўнасе (1988), у Сенежы “Мастак і экалогія” (1989), у Варшаве і Шчэціне (1991, Польшча).

Алег Крошкін стаў удзельнікам шэрага міжнародных і рэспубліканскіх пленэраў, сярод якіх: “Мастак і экалогія” (1991, Сенеж, Маскоўская вобл.), І Міжнародны пленэр імя М. Шагала (Віцебск, 1994), «PANODERAMA» (2003, Франкфурт-на-Одэры (Германія), пленэр у г. Рэзекне (2008, Латвія), пленэр, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння І. Хруцкага (2010, Полацк) і інш.

Але галоўнымі для А. Крошкіна, канешне ж, былі яго персанальныя выставы. У Віцебску персанальныя экспазіцыі арганізоўваліся мастаком даволі часта: у 1990, 1991, 1997 гг. Хоць і не ўсе пералічаныя выставы ў назве ўтрымлівалі слова “Віцебск” (як гэта было ў выпадку з выставай 1991 года), але, па сутнасці, менавіта родны горад быў дамінантай вобразнасці ў творах, што экспанаваліся.

Да свайго 50-годдзя мастак зладзіў персанальную выставу ў Віцебску, на якой паказаў 56 работ (2000). Персанальная выстаўка “Калаж” у Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску (2004) звярнула ўвагу гледачоў на яшчэ адзін прыярытэт у творчасці А. Крошкіна. Да таго ж у сталіцы Беларусі гэта была першая маштабная экспазіцыя жывапісных палотнаў віцебскага мастака. У 2005 годзе экспазіцыя твораў А. Крошкіна пад назвай “Жывапіс, графіка, калаж” адбылася ў выставачнай зале віцебскага музея “Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва”. Выставы Крошкіна ў Віцебску таксама праходзілі ў 2008, 2009, 2012 гадах.

Персанальная выстава Алега Крошкіна “Cherchez la femme”, што дэманстравалася

Репозиторий ВГУ

ў 2014 годзе ў Віцебску ў арт-цэнтры Марка Шагала і ўключала 37 работ, выклікала хвалю самых разнастайных эмоцый у наведвальнікаў. У большасці твораў прасочвалася іронія мастака-постмадэрніста над сучаснай поп-культурай, гламурнай рэкламнай прадукцыяй. Тут было ўсё: вобразы сацыялістычнага рэалізму, сімвалы кітча, гламуру, эратызм, пачуццёвасць... І разам з тым карціны мастака глядзеліся як “сплаў фундаментальнасці і тонкасці ... паглыбленасці ў сябе і адкрытасці свету... Жарсці і інтэлекту” [7]. Нягледзячы на розныя інсінуацыі абураных эпатажнасцю гледачоў мастак сцвярджаў: выстава прысвечана ЖАНЧЫНЕ. “Жанчына – гэта ўсё, – пераконваў апанентаў А. Крошкін, – менавіта з-за яе ўсё ў мастацтве і робіцца. (...) Жанчына – гэта муза, якая натхняе, гэта яе цела, якое хочацца маляваць” [3].

У 2016 годзе адбыліся дзве персанальныя выставы А. Крошкіна: “Погляд” у Віцебскім мастацкім музеі і “Калаж” у Віцебскай абласной бібліятэцы імя У. Леніна.

Колеру былі прысвечаны некалькі выстаў Алега Крошкіна: экспазіцыя “Музыка колеру” ў рамках XXIX Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі (2016, канцэртная зала “Віцебск”) і “Магія колеру” (2017, Віцебская абласная бібліятэка імя У. Леніна). У 2018 годзе на адкрыцці сваёй экспазіцыі ў Віцебскім мастацкім музеі, дзе былі выстаўлены 43 жывапісныя кампазіцыі, творца падкрэсліваў: “Галоўны герой ўсіх маіх работ – колер, які, як музыка, выклікае эмоцыі на інтуітыўным узроўні, стварае настрой і перадае яго гледачу” [6].

У 2000-х А. Крошкін удзельнічае ў міжнародных выставах “Калегіум” (2014, Орша), “Паэзія колеру” (2014, Масква (Расія), “Разрэз у мастацтве” (2014, Санкт-Пецярбург (Расія). Не менш значным, цікавым і адказным для мастака з’яўляўся ўдзел у рэспубліканскіх праектах – І і IV біенале жывапісу, графікі і скульптуры (2008, 2014, Мінск), прадстаўнічых і шырокамаштабных праектах Віцебскай абласной арганізацыі БСМ – выставе, прысвечанай 40-годдзю ВАА ГА “Беларускі саюз мастакоў” (2009, Віцебск), выставе “Мастацкая прастора Віцебшчыны” (2010, Мінск) і праекце “Зямля пад белымі крыламі” (2010, Віцебск).

Алег Крошкін не мог не адгукнуцца на праекты, прысвечаныя яго alma mater. Абедзве юбілейныя выставы выкладчыкаў і выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава, прымеркаваныя да 40-годдзя і 50-годдзя факультэта, прайшлі з яго ўдзелам (1999, 2009, Віцебск).

Запрашалі Алега Крошкіна на авангардныя праекты, сярод якіх прыгадаем выставу, прысвечаную 80-годдзю УНОВІСа (2000, Віцебск), арт-праект “Abstract” (2014–2017). Мастак прымаў удзел і ў шэрагу іншых віцебскіх праектаў (“The Best” (2008), “АРТ-сезон” (2009–2015), “Партрэт горада” (2010–2017), “M’ART” (2011), “ZOOparkin” (2014) і інш.

Музыка і магія колеру... Гэтыя словы ў апошнія гады жыцця Алег Крошкін неаднаразова выкарыстаў у назвах сваіх персанальных выстаў. Экспазіцыя, якую мастак прадставіў у Віцебскай абласной бібліятэцы ў верасні 2020 года, на жаль, стала апафеозам яго творчага шляху, хоць планавалася ўсяго толькі як адна з першых у чарадзе выстаў, прысвечаных 70-гадоваму юбілею мастака. Асноўнай вобразнай дамінантай у работах, якія экспанаваліся на апошняй прыжыццёвай выставе Алега Крошкіна, вядома ж, быў колер.

**Творчыя прыярытэты і характар вобразнасці.** Калі ўглядаемся ў творы Алега Крошкіна, то не пакідае адчуванне парадаксальнай, радаснай і разам з тым іранічнай гульні мастака з вобразамі. Гледача прыцягваюць і падкупаюць не толькі своеасаблівая мова ў яго жывапісных і графічных кампазіцыях, іх стылістычныя асаблівасці, але адметнае вобразна-пластычнае мысленне іх аўтара. Мысленне, якое ў шырокім сэнсе можна было б назваць калажным.

Калажнае мысленне, якое ці не з самага пачатку творчасці стала яскравай прыкметай творчасці Алега Крошкіна, сваімі вытокамі мела зварот мастака да спадчыны авангарда першай паловы XX стагоддзя. Знаёмства А. Крошкіна з творамі П. Пікаса раскрыла яму ў першую чаргу тэхніка-тэхналагічныя асаблівасці калажу. А вось цэласнасць і завершанасць аўтарская манера Крошкіна набыла дзякуючы некаторым асноватворным прынцыпам постмадэрнізму, які стаў крэатыўнай прасторай для жывапісных эксперыментаў віцебскага мастака.

Выпускнік мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута Алег Крошкін з асаблівай павагай успамінаў свабодную атмасферу творчасці 1970-х гадоў, сваіх педагогаў – І. Сталярова, А. Някрасава, А. Арлова, Л. Дзягілева, але сапраўднымі сваімі настаўнікамі ўсё ж такі лічыў мастакоў сусветнага авангарда. Не спрабуючы пераймаць іх творчыя манеры, Алег шукаў сябе, імкнуўся здабыць свой уласны почырк. А таму вучыўся бачыць і разумець.

Важным этапам у творчасці Алега Крошкіна стала другая палова 1970-х гадоў. У працах гэтага перыяду відавочны зварот мастака

Рэпазіторый ВДУ

да паэтыкі «гарадскога фальклору», традыцый прымітывізму. І, канешне ж, праца ў гэтым кірунку звязана з актыўным засваеннем магчымасцей калажу. Прычым не толькі як тэхнікі выканання твора, як кампазіцыйнага і тэхнічнага прыёму, але як спосабу ўспрымання і адлюстравання сучаснага свету, як універсальнага прынцыпу паэтыкі мастацтва другой паловы XX стагоддзя.

Калаж для Алега Крошкіна на некалькі дзесяцігоддзяў становіцца асноўным прынцыпам рэпрэзентацыі мастацкіх вобразаў. Як і для большасці мастакоў другой паловы XX стагоддзя, калаж для віцебскага творцы – знак эпохі і вобраз часу, мова і прастора. З яго дапамогай мастак у сваіх кампазіцыях стварае новую рэальнасць, дзе калейдаскоп аўтарскіх уражанняў ператвараецца ў прастору нечаканых візуальных і сэнсавых асацыяцый. Паэтыка паўсядзённасці ў гэты час вызначае фармат жанравых інтэрпрэтацый у творах А. Крошкіна. У сюжэтных кампазіцыях штодзённасць набывае то пафасна ідылічны, рамантычны, то гратэскава-іранічны характар.

У 1980–1990-я гады гарадскія “візуальныя апавяданні” А. Крошкіна не пазбаўленыя тэатральнасці. Адсутнасць лінейнай паслядоўнасці падзей у выяўленчых сюжэтах, магчымасць іх вольнай камбінацыі гледачом вельмі нагадваюць постмадэрнісцкія гіпертэксты. Гэтыя міні-наратывы блізкія да фальклору, часам музычна-паэтычныя, іх вылучаюць высокая канцэнтрацыя сэнсу і лаканізм у выкарыстанні выяўленчых сродкаў. Актыўнасць і дэкаратыўнасць колеру пры гэтым застаюцца абавязковымі спадарожнікамі твораў мастака. Адначасова мастацкая прастора ў карцінах А. Крошкіна складаецца з асобных сюжэтных сцэнак, якія маюць лубачны характар. Сярод іх нязменна лідзіруюць вобразы вячэрняга Віцебску. З уласцівымі яму матывамі правінцыйнага жыцця, знакамі і сімваламі роднага горада.

Асобныя фрагменты кампазіцый падобныя на мемы, у якіх у іранічна-кульмінацыйнай форме прадстаўлены сцэны спатканняў, шпацыру, вячэрніх забаў і інш. І, канешне ж, тэма кахання, нястрымнай жарсці, закладзеная ў чалавечай прыродзе, у працах Алега Крошкіна прысутнічае ў самых розных варыяцыях.

У межах паэтычнага дыскурсу для надання асаблівай выразнасці вобразам мастак у сваіх кампазіцыях выкарыстоўвае разнастайныя тыпы гэгаў, якія выклікаюць смех. Дамінуючая роля належыць гэгам скажэння, якія закранаюць знешнасць (твар, адзенне, фігуру), паводзіны персанажаў (жэсты, міміку, позы), сітуацыю ў цэлым. У адной кампазіцыі могуць адначасова існаваць некалькі груп вобразаў, кожная з якіх вылучаецца сваім алгарытмам паводзін. У цэлым перад намі архетыпы нашых сучаснікаў, з дапамогай якіх Крошкіну ўдаецца стварыць свой дзіўны напоўнены глыбокім лірызмам вобразны свет.

Іронія ў Крошкіна паўстае як структурны прынцып яго твораў, пранізвае паэтыку вобразнасці, пранікае ва ўсе яе пласты. Шырокая варыятыўнасць праяў іранічнага падкрэслівае яго амбівалентны характар і ў творах мастака паўстае то як метафара, то як відавочны гратэск. Гэта зусім не здзек і не насмешка. Іронія Крошкіна – своеасаблівы візуальны аўтарскі “сцёб”, не напышлівы, не дробязны і не злосны. Магчыма, гэта нейкая ступень свабоды, рух аспрэчвання норм і правілаў, а можа і шлях да ісціны? Асабліва важна і тое, што аўтарская метаіронія ў палотнах мастака злучана з пабудовай пэўнага кантэксту ўспрыняцця вобразаў.

Іронія і гульня з’яўляюцца дзвюма канстытуяванымі катэгорыямі мастацкага свету А. Крошкіна на ўсім працягу яго творчага шляху. Таксама і цікавасць мастака да паэтыкі “гарадскога фальклору”, і дыскурс наіўнасці застаюцца блізкімі мастаку на розных этапах, дапамагаюць распрацоўваць дадзены накірунак у новых і новых жывапісных творах. Сродкамі мастацкай выразнасці становяцца колер, рытмічная інтанацыя, тэмпаральнасць, фактурнасць і ў цэлым агульная архітэктоніка кампазіцыйнага і жывапіснага ладу карціны.

Гульня з вобразамі ў розных яе праявах займае важнае месца ў творчасці мастака і ў 2000-я гады. Для А. Крошкіна гульня выступае свайго роду прасторай творчага мыслення і эксперыментаў, механізмам рэалізацыі свабоды ад сацыякультурных стэрэатыпаў.

Паэтыка вобразнага поля ў творах А. Крошкіна літаральна пранізана не толькі іроніяй, але і эратызмам, сілай жарсці. Мастак часам дэманструе поўную свабоду ад этычных забаронаў, эпаціруе гледача эротыкай і антыэстэтыкай сюжэтаў, падкрэслівае сэксуальнасць, робіць яе элементам свайго новага іміджу, які больш выразным становіцца ў 2000-я гады. У гэты час А. Крошкін нароўні з захопленасцю эксперыментамі з колерам звярнуўся і да своеасаблівай інтэрпрэтацыі твораў заходняй масавай культуры. Не з’яўляючыся прыхільнікам кітча і гламуру, ён з відавочнай іроніяй “перапявае” папулярныя матывы рэкламных постараў і гламурных часопісаў. У гэтым кантэксце мастак даволі фрывольна адлюстроўвае аголенае жаночае цела. Эксцэнтрычнасць падобных жэстаў разлічана не столькі на эпатаж гледача,

Репозиторий ВГУ

колькі на ўзмацненне парадаксальнасці адлюстраванага, на правакацыю смеху і задавальнення.

Сваю асаблівую цікавасць да жанру партрэта мастак не аднойчы падкрэсліваў у розных інтэрв'ю. Выразнай квінтэсэнцыяй любові мастака да псіхалогіі вобразаў становіцца вялікая серыя аўтапартрэтаў мастака і партрэтаў яго сяброў і знаёмых.

Колер дапамагаў А. Крошкіну выказаць сваю ўласную сутнасць. Пачынаючы з 2010-х гадоў мастак нібы акунуўся ў асэнсаванне сутнасці колеру, спрабуючы зразумець і адлюстраваць каляровую мадэль часу, сэнс колеру, яго музыку. Гэта былі гульні і эксперыменты з усталяваннем эмацыянальных каляровых дамінантаў, пабудовай каляровых асацыяцый, супастаўленнем рытмікі каляровых мас і апусканнем у алхімію абстрактных канструкцый. Колер у абстрактных кампазіцыях Крошкіна – медыятар эмацыянальнага і філасофскага адначасова. Безумоўна, у эмацыянальным уздзеянні колеру ў працах мастака вялікае значэнне мае рытм і характар каларыстычных спалучэнняў. Яркасць жывапіснага строю, шматколернасць непазбежна выклікаюць у гледача адчуванне радасці і пазітыву.

**Заключэнне.** Даволі шырокі дыяпазон мастацкіх прыярытэтаў у творчасці А. Крошкіна яскрава дэманструе яго прыхільнасць да эстэтыкі постмадэрнізму. Алег Крошкін вельмі сур'ёзна ставіўся да сваёй творчасці і заўсёды падкрэсліваў, што ў мастацтве важна быць шчырым, што "ўсё павінна ісці ад душы. Калі чалавек таленавіты, у яго інтуітыўна нараджаецца свая манера. Гэтаму ніхто не вучыць, усё здабываецца эмпірычным шляхам" [8]. А таму, калі адпраўляўся ў сваю маленькую майстэрню, як ён казаў, "фарбаваць", мастак кожны раз, як у дзяцінстве, радаваўся, бо мог пісаць тое, што сабралася ў яго ў душы ... Пры гэтым як максімаліст не забываў і пра мэту. "Без гэтага мастак – не мастак. Вядома, мэта – не змяніць свет, але сказаць сваё слова ў мастацтве" [3]. Здаецца, Алегу Крошкіну гэта ўдалося зрабіць у поўнай меры.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Олег Крошкин. Биография [Электронный ресурс] // Олег Крошкин. Сайт художника. – 2004. – Режим доступа: http://kroshkin.info/biography.html. – Дата доступа: 02.11.2020.

2. Вакар, Л. «Вы хотите изящных картин – их есть у меня!» / Л. Вакар // Бюллетень Музея Марка Шагала. – 2009. – Вып. 16–17. – С. 25–30.

3. Олег Крошкин. За чашкой кофе [Электронный ресурс] // Олег Крошкин. Сайт художника. – 2004. – Режим доступа: http://kroshkin.info/coffee.html. – Дата доступа: 02.11.2020.

4. Корженевский, Г. Олег Крошкин: «Лица необщее выражение» [Электронный ресурс]. // Витебский курьер. – 2016. – 18 авг. – Режим доступа: https://vkurier.by/68873. – Дата доступа: 05.11.2019.

5. Цыбульский, М.Л. Крошкин Олег Владимирович / М.Л. Цыбульский // Регионы Беларуси: энцикл.: в 7 т. / редкол.: Т.В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2: Витебская область, кн. 2. – С. 6–7.

6. Крупица, Н. Арт-проект «Магия цвета» известный витебский художник Олег Крошкин готовил специально для фестивального Витебска / Н. Крупица // Витьбичи. – 2018. – 18 июля.

7. Корженевский, Г. Олег Крошкин: художник, который никого не оставляет равнодушным [Электронный ресурс] // Народныя навіны Віцебска. – 2014. – 26 кастр. – Режим доступа: https://vitebsk.cc/2014/10/26/oleg-kroshkin-hudozhnik-kotoryiy-nikogo-ne-ostavlyaet-ravnodushnyim. – Дата доступа: 05.11.2019.

8. Корженевский, Г. Олег Крошкин: художник интуиции и карнавального мира [Электронный ресурс] // Витебский курьер. – 2015. – 13 авг. – Режим доступа: https://vkurier.by/25158. – Дата доступа: 05.11.2019.

*Паступіў у рэдакцыю 20.01.2021*

Репозиторий ВГУ